

Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць! Я.Купала

Купалінка

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

№ 08 (49) • ЛІСТАПАД 2014

ПРАЕКТ "Я БЫЎ ТУТ":

ГІСТОРЫЯ НА БЕРАСЦЕЙСКІХ ВУЛІЦАХ



Берасце – сапраўдны гістарычны скарб постацяў, якія ўслаўлялі, развівалі і абаранялі родны куток. Гэта і Казімір Лышчынскі, Мікалай Радзівіл Чорны, Саламон Грынберг, Юліян Урсын Нямцэвіч, Ягайла, Вітаўт і іншыя героі.

Падрабязна спынюся на асобах, якія ўшанаваў берасцейскі праект "Я быў тут" пад эгідай АРР "Дзедзіч".

Даведка: каманда праекта "Я быў тут" – тры ідэйныя берасцейскія дзяўчыны (Алена Каховіч, Вольга Сыраватка і Вольга Ярамчук).

Алена Каховіч пра назву праекта:

- Я думаю ўсе бачылі надпісы кшталту "тут быў Вася". У свядомасці людзей запраектавана захаваць нешта пасля сябе. У гісторыі Берасця такіх прыкладаў шмат. Хтосьці славіў горад сваёй плённай навуковай працай, хтосьці ўнёскам у архітэктурнае аблічча горада, а хтосьці падараваў гораду Магдэбургскае права.

Героі праекту "Я быў тут":

Мікалай Радзівіл Чорны – канцлер Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), ваявода віленскі, заснавальнік Нясвіжскай лініі роду Радзівілаў. У Берасці Мікалай адчыніў друкарню і ў 1563 годзе была выдадзена Берасцейская Біблія.

Саламон Грынберг – архітэктар, пабудаваў у Берасці аптэку ў 1923 годзе, якая працуе і сёння.

Юліян Урсын Нямцэвіч – ад'ютант і сакратар Т. Касцюшкі. Вучыўся ў Берасцейскім езуіцкім калегіўме 7 год.

Ягайла – вялікі князь літоўскі падараваў у 1390 годзе Берасцю Магдэбургскае права.

Вітаўт – адзін з найбольш вядомых кіраўнікоў ВКЛ. Фундатар шматлікіх берасцейскіх храмаў. У свой час пацвердзіў Магдэбургскае права.

Алена Каховіч пра постаці праекта:

- Асобы для праекта адбіраліся трошкі хаатычна, але кожны з іх зрабіў значны ўнёсак у развіццё горада ў розныя часы. Часу, калі Берасце ўваходзіла ў склад ВКЛ, надаецца асобая ўвага. Але, і Нямцэвіч, і Грынберг рабілі таксама важныя справы ў свой час.

Прагульваючыся па берасцейскіх вуліцах прыемна і нечакана было сустрэць гістарычных асоб, пра некаторых папоўніць свае веды, напрыклад пра Саламона Грынберга і яго аптэку.

Як паведаміла Алена Каховіч, з 17 па 24 лістапада прайшоў фотаконкурс "Зрабі сэлфі з гістарычнай постаццю". Трэба было знайсці на вуліцах Берасця выяву асобы (Ягайлы, Вітаўта, Грынберга, Нямцэвіча ці Радзівіла), зрабіць з імі так званае сэлфі і абавязкова паставіць хэштэг #byutut. Пасля будуць собраны ўсе фотаздымкі з хэштэгам і адабраны лепшыя.

Дзяўчыны з праекту адзначылі, што дапамагала і малявала гістарычныя постаці берасцейская мастачка Вольга Стрыжнёва.

Група "Я быў тут" Укантакце: vk.com/byutut

З пытаннямі можна звяртацца на пошту: dzedzich@tut.by.

dzedzich.org

ВЕЛАФОРУМ-2014

Кампанія «За вела-Брэст!» паўдзельнічала ў велафоруме, які ў гэтым годзе быў арганізаваны ў Львове.



Такі велафорум праходзіць ва Украіне ўжо ў шосты раз і збірае паў-Эўропы. На гэты раз «на каву да Львіва» прыехалі ўдзельнікі не толькі з усей Украіны, але і з Польшы, Чэхіі, Францыі, Латвіі, Эстоніі, Бельгіі і канешне, Беларусі. Трэба адзначыць, што акрамя кампаніі «За вела-Брэст!», Беларусь яшчэ прадстаўлялі «Менскае роварнае таварыства».

Арганізатарамі форума выступаюць не толькі роварныя ініцыятывы, але і мэрыя Львова, што таксама надае мерапрыемству грунтоўнасці і павагі. Таму і сам форум доўжыўся тры дні, кожны са сваёй тэматыкай. Першы, найбольш афіцыйны дзень, праводзіўся ў мэрыі, там абмяркоўвалі пытанні звязаныя з мясцовымі органамі самакіравання і транспартнымі планавальнікамі. А потым, удзельнікі першага дня праехаліся па горадзе, паглядзець ды ўласнаручна абкатаць ўжо створаную роварную інфраструктуру, каб адчуць усе дахопы і недахопы.

Наступны, другі, дзень форума тычыўся пытанняў велаінфраструктуры, агульнай папулярызацыі ровароў. Усе гэта з міжнароднымі прыкладамі, графікамі-схемамі і карыснай інфармацыяй. Цікавы даклад быў у Міхаіла Пжепюркі. Які з'яўляецца роварным афіцэрам Любліна, ён вырашае пытанні велаінфраструктуры і развіцця роварнага руху ў горадзе. Дэрэчы, менавіта Люблін горад-лідар ў Польшы ў намінацыі вела-фрэндлі.

Што тычыцца Львова то тут быў арганізаваны фестываль «Rover Film Festival; круці педалі — глядзі кіно!». Сэнс гэтага фестывалю ў тым, што ўдзельнікі каб атрымаць электрычнасць для прагляду сацыяльных фільмаў павінны круціць педалі ровару з дынама-машынай.

Пасля такіх дакладаў, можа падацца, што мы з вамі жывем ў каменым вяку роварнай цывілізацыі. Але пасля, уё ж пагаджаешся з сівой беларускай мудрасцю «працуй пільна і тут будзе Вільна». Менавіта пра асобную актыўнасць пэўных велаактывістаў, велаініцыятыў і іх уражлівыя вынікі гаварылі на трэццім, заключным дню форума.



Пазнавальны і з гумарам даклад быў у прадстаўніка Львоўскай рады. Ён распавёў, што змянілася ў Львове ў апошнія часы. Жыхарам Львова пашансавала што іх мэр любіць ровары, таму канешне і велаінфраструктура развіваецца больш актыўна.

Шмат каму знаёма праблема крадзяжоў ровараў. Каманда праект Backmy.bike стварыла мабільную пляцоўку куды пацярпелыя могуць кідаць свае ровары і звяртацца за дапамогай.

Напрыканцы канферэнцыі роварная эстафета была перададзена Крывому Рогу, дзе ў наступным годзе будзе адбывацца Велафорум.

Удзел у такім форуме для прадстаўнікоў з Беларусі быў вельмі карысным. Цікава было паглядзець якія існуюць праблемы ў розных краінах і як яны іх пераадольваюць. Спадзяемся, што ў хуткім часе такі велафорум пройдзе і ў Беларусі.

dzedzich.org

БРЕСТЧАНИН СДЕЛАЛ КАЛЕНДАРЬ С УНИКАЛЬНОЙ «ПОГОНЕЙ»

Настенный календарь с изображением «Погони» со старинной гравюры сделал активист Движения «За свободу» Денис Турченяк.

Идея сделать оригинальный календарь с исторической символикой у него возникла давно. Самым сложным было найти оригинальное изображение соответствующего качества, которое бы стало центральным элементом будущего печатного продукта.

«Искал в интернете, в книгах, но ничего подходящего найти не мог. Однажды зашел на польский интернет-аукцион, где мне удалось приобрести гравюру немецкого гравера Альбера Вогеля (Albert Vogel 1814-1886), созданную им по рисунку известного польского художника Юлиуша Коссака.

Коссак известен тем, что создал множество полотен, на которых изображены батальные сцены с участием кавалерии», - пояснил Денис Турченяк.

После приобретения брестчанин начал искать печатные источники, в которых могла быть опубликована данная «Погоня».

«Первое и пока единственное мне известное изображение этой гравюры в печатных источниках появилось в изданной в 1856 году книге «Zrzodlopisma do dziejow Unii Korony Polskiej i W. Ksiestwa Litewskiego. Значит, сама гравюра была изготовлена ранее этого срока, а возможно и специально для этого издания. Гравюра, опубликованная в книге, немного отличается от моей. На моей есть подпись: «Wlasciwy herb litewski». В книге этого нет», - поделился автор.

Приобретенный оригинал брестчанин отсканировал и с помощью дизайнера создал макет календаря, который затем отпечатал на матовой бумаге формата А2 небольшим тиражом.

Пока приобрести продукт можно лишь в некоторых магазинах Минска и Бреста.

рух.by

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО ТОЗИКУ

МНОГОДЕТНАЯ МАМА НАПИСАЛА ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО ТОЗИКУ.

Уважаемый Анатолий Афанасьевич!

Я бы никогда не написала Вам это письмо, если бы не одно обстоятельство — у меня есть надежда, что на все сказанное Вы посмотрите не с позиции чиновника. Ваш внук и мои дети учатся в одном учреждении образования, более того, моя дочь — в параллельном классе. На мои письма чиновникам всегда приходит ответ в установленный законом срок, но гражданам нужны не ответы, а решения. Чиновники видят планы и нормы, мамы и дедушки — живых детей и их проблемы.

Анатолий Афанасьевич, я прочла в новостях о Вашей обеспокоенности тем, что Беларусь отстает по количеству часов, учебных дней в году от мировых лидеров образования и привели в пример ряд стран, например Японию, где учатся 260 дней в году. «Если эту ситуацию не поправлять, то мы можем начать выпускать в жизнь неконкурентоспособное поколение», — предупредили Вы Совмин в своем отчете.

Честно Вам скажу, я очень испугалась. Моя дочь три дня из пяти заканчивает обучение в школе в 14.10, после она едет в обычную музыкальную школу к 14.40 и занимается там с «форточкой» до 18.10, домой возвращается не раньше 19.00. В 20.00 она садится готовить домашнее задание на завтра по четырем-пяти предметам. Я подумала: «Боже мой! Японцы точно камикадзе!» и начала читать о японской системе образования.

Анатолий Афанасьевич, Вы не сказали Совмину, что в Японии начальная школа состоит из 6 классов, где учатся до 12 лет, количество уроков в день не больше четырех при продолжительности 45 минут, и домашних заданий в их начальной школе не задают совсем. Я пересчитала наши пятые и шестые уроки, а также предусмотренные санитарными нормами два часа на домашнюю работу (кстати, часто нужно больше двух), соотнесла этот объем к японской модели, и у меня получилось, что **наши дети учатся больше японских на 59 дней.** Прошу Вас учесть эту информацию, если Вы всерьез считаете, что проблема качества образования решается количественными показателями.

Вы также привели в пример Францию и тоже только в контексте количества дней обучения, но во Франции вместе с увеличением дней у наиболее талантливых учеников есть возможность закончить среднее образование со степенью бакалавра. К ученикам, в зависимости от способностей, применяется индивидуальный подход в обучении. Ваше предложение запретить шестилеткам посещать детские сады, если нет медицинских показаний, и отправиться в школу - индивидуальные особенности ребенка не учитывает. А ведь Вы сами признали, что качество учебников и легкость усваивания материала это острая проблема. Не каждый детский ум способен ее преодолеть в 6 лет.

Хотела обратить Ваше внимание на другой аспект проблемы учебников. Я взяла у соседки весы, чтобы проверить, соответствует ли упомянутым нормам вес рюкзака пятиклассника. Стоит упомянуть, что соседка — студентка дневного отделения 4-го курса педуниверситета и учитель по совместительству. Из-за дефицита кадров на ставку работают и другие девушки в ее группе. Все с согласия деканата, разумеется. Разрешат ли работать третьекурсникам, если Вы увеличите количество часов обучения, вот в чем вопрос. А весы показали полное соответствие с нормой — 3 кг. Честно, я успела подумать «значит, так и надо», но учительница обсмеяла наивную мать: «Да знают они прекрасно, сколько весят эти ранцы и под это нормы подгоняют, 10-15% веса ребенка, ну-ну».



Татьяна Яворская, председатель совета общественного объединения «Звено». Замужем, воспитывает троих сыновей и дочь.

Анатолий Афанасьевич, тогда я сделала по-другому. Я положила в свой рюкзак 10% своего веса, 6 килограммов (не тот случай, когда по-женски привешь), надела на 1,5 часа и сделала вывод — так не надо. Каждый в Минобразования сделает такой вывод, если проведет над собой такой простой эксперимент. И это как раз та проблема, решить которую можно «без создания каких-либо рабочих групп» — **нужно просто выдавать желающим учебники в электронном виде**.

Я горячо поддерживаю сказанное Вами о распределении — «школе нужен хороший учитель, а не временщик». Но знаете, по моим оценкам, дело не только в текучке. В классе моего старшего сына в том же учреждении образования недовольные качеством преподавания одного из предметов родители обратились к классному руководителю с этим вопросом. Нам объяснили, что учитель «работает по распределению и заменить его нельзя». Очень глупая ситуация получилась, хоть и на два года. С другой стороны, у нас была талантливая учительница по английскому, которая после отработки ушла в переводчики. А это уже грустная ситуация.

Я поинтересовалась, как в Японии, Анатолий Афанасьевич. Узнала, что профессия учителя весьма престижна в связи с высокой зарплатой. Чтобы стать учителем, кроме высшего образования нужно дополнительно сдать на лицензию, а потом еще при приеме на работу в школу совет школы устраивает экзамен среди кандидатов, чтобы выбрать лучшего. Я не буду говорить Вам неприятные вещи, озвучивать проходной балл в наш педагогический университет, Вы его сами знаете. Мне только кажется, что ситуация «зачислены все абитуриенты, подавшие заявления» — это перебор. Я думаю, это как-то связано с вопросом о количестве часов. Простите за плохой тон, но вспомнился анекдот «три раза объяснил, уже сам понял, а они не понимают».

Анатолий Афанасьевич, Вы правильно отметили тревогу учителей белорусского языка. Я хотела бы добавить, что Ваш внук и моя дочь учатся в учреждении образования с белорусским языком обучения, но вынуждены приобретать контурные карты, атласы, рабочие тетради по предметам на русском языке в связи с тем, что на белорусском их не издают вообще или малым тиражом. К слову о том, что родители заняли «позицию сторонних наблюдателей», родители обращались по этому и другим вопросам в Минобразования, но,

как я уже говорила выше, мы получаем ответы в установленный законом срок, а не решения.

Анатолий Афанасьевич, к концу этого письма я сама стала камикадзе и скажу последнее. И Вы, и мы, родители, одинаково понимаем, что качество образования не улучшается от увеличения количества часов. Качество образования улучшается методиками, индивидуальным подходом и подготовленными кадрами. А увеличить количество часов можно только для прикрытия бездействия или несостоятельности в решении этих вопросов. Так вот, Анатолий Афанасьевич, знайте - король голый!

tut.by

БНФ ВЫСТУПАЕ ЗА АДЗІНАГА КАНДЫДАТА

ЯКІМІ БУДУЦЬ ВЫБАРЫ-2015, КАЛІ АПАЗІЦЫЯ НЕ ВЫЛУЧЫЦЬ АДЗІНАГА КАНДЫДАТА?

«Я перакананы, калі не атрымаецца дамовіцца наконт адзінага, то падзеі будуць разгортвацца вельмі сумна», – падкрэсліў у праграме «Размова Калінкінай» на тэлеканале Белсат старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч.

Калі апазіцыя не пойдзе адзіным фронтам на прэзідэнцкія выбары ў 2015 годзе, то некалькі апазіцыйных прэтэндэнтаў рызыкуюць не набраць па 100 тыс галасоў дзеля рэгістрацыі ў кандыдаты. «Подпісы неабходна сабраць фактычна за 4 тыдні. У сённяшняй сітуацыі гэта вельмі няпроста, бо ёсць надзвычай вялікая апатыя ў грамадстве», – заўважыў спадар Янукевіч.

Паводле яго, цяпер беларусы неахвотна размаўляюць пра палітыку. На прэзідэнцкіх выбарах цікавасць да палітычных падзеяў можа павысіцца, але не будзе незвычайна вялікай, прагназуе палітык.

Вылучэнне адзіным кандыдатам ад апазіцыі палітвязня Мікалая Статкевіча – не першасны варыянт, але магчымы, заўважыў спадар Янукевіч:


– Калі мы пераканаемся, што абсалютна выключаныя тыя варыянты, якія дазваляюць падчас гэтай выбарчай кампаніі пайсці шырэй у грамадства і працаваць не толькі на дэмакратычны электарат, але і на тых, хто пакуль не на нашым баку, пазмагацца за гэтую большасць. Тады мы зможам разглядзець варыянт вылучэння Міколы Статкевіча, што будзе формай байкоту гэтых выбараў і фактычна азначае працу перадусім з дэмакратычным сегментам грамадства, – адзначыў прадстаўнік апазіцыі.

17 лістапада 5 палітычных сілаў з дэмакратычнай «сямёркі» – Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Рух «За Свабоду», кампанія «Гавары праўду», Партыя БНФ і аргкамітэт па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» – узгаднілі працэдуру вылучэння адзінага кандыдата на адмысловым кангрэсе, што мае прайсці ў траўні.

Аб'яднаная грамадзянская партыя і Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» пакуль не далучыліся да пагаднення аб вылучэнні адзінага.

Белсат

ДОСТУПНО ЛИ У НАС КАЧЕСТВЕННОЕ ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ



Купалінка

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

• **Заснавальнік** – Суполка "Усход-2" гарадской арганізацыі Партыі БНФ
• Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранага карыстання
• **Падпісана ў друк** 28.11.2014 года ў 12-00
• Папера афсетная, 0,5 ул.-друк. аркуша, фармат А4. Гарнітура Myriad
• Надрукавана на памнажальнай тэхніцы сябраў рэдакцыі
• **Наклад:** 299 асобнікаў
• Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
• **Галоўны рэдактар:** Уладзімір ТАРНОЎСКІ
• **Рэдакцыйная калегія:** Кірыл КАТОВІЧ, Наста ПАПЯЛОЎСКАЯ, Ульяна ВЕНЦЕЛЬ
• **Кантактны тэлефон: (029) 222-58-22, (029) 660-57-41**
• **E-mail:** kupalinka_bnf@tut.by